*УДК 378.12*

## КАФЕДРА РЫТОРЫКІ І МЕТОДЫКІ ВЫКЛАДАННЯ МОВЫ І ЛІТАРАТУРЫ ФІЛАЛАГІЧНАГА ФАКУЛЬТЭТА БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА ЎНІВЕРСІТЭТА: ГІСТОРЫЯ І СУЧАСНАСЦЬ[1]

**А. А. Акушэвіч[1)], І. У. Таяноўская[2)]**

*[1)] Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*вул. К. Маркса, 31, 220030, г. Мінск, Беларусь, AkushevichAA@bsu.by*
*[2)] Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*вул. К. Маркса, 31, 220030, г. Мінск, Беларусь, tayanovskayaiv@bsu.by*

У матэрыялах даклада з’яўляецца мэтай аглядна асвятліць асобныя асноўныя вехі ў станаўленні і развіцці кафедры спецыфічнай, унікальнай для Рэспублікі Беларусь рыторыка-метадычнай накіраванасці – кафедры рыторыкі і методыкі выкладання мовы і літаратуры філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Сістэмна адлюстраваны розныя аспекты дзейнасці кафедры, у тым ліку значныя напрамкі вучэбна-метадычнай, навукова-даследчай, арганізацыйна-выхаваўчай работы. Гэта можа прадстаўляць практычную цікавасць пры ўліку для далейшага развіцця і функцыянавання тых структурных падраздзяленняў універсітэтаў, якія забяспечваюць вышэйшую прафесійную падрыхтоўку студэнтаў, што атрымліваюць педагагічныя кваліфікацыі.

***Ключавыя словы:*** Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт; філалагічны факультэт; кафедра як структурнае падраздзяленне; методыка выкладання мовы; методыка выкладання літаратуры; рыторыка.

## DEPARTMENT OF RHETORIC AND METHODS OF TEACHING LANGUAGE AND LITERATURE OF THE FACULTY OF PHILOLOGY OF THE BELARUSIAN STATE UNIVERSITY: HISTORY AND PRESENT

**A. A. Akushevich[a)], I. U. Tayanovskaya[b)]**

*[a)] Belarusian State University, K. Marx St., 31, 220030, Minsk, Belarus, AkushevichAA@bsu.by*
*[b)] Belarusian State University, K. Marx St., 31, 220030, Minsk, Belarus, tayanovskayaiv@bsu.by*

The purpose of the report is to provide an overview of the main milestones in the establishment and development of the Department of Rhetoric and Methods of Teaching Language and Literature of the Belarusian State University. Various aspects of the department's activity are systematically reflected, including significant areas of teaching

[1] Пры падрыхтоўцы дадзенай публікацыі выкарыстана частка раней калегіяльна ўзгодненых прэзентацыйных матэрыялаў, падрыхтаваных прафесарам В. У. Праскаловіч, дацэнтам Т. У. Рубанік і іншымі супрацоўнікамі кафедры.

and methodological, research, organizational and educational work. This can be of practical interest when taking into account the further development and functioning of those structural divisions of universities that provide higher professional training for students, which receive teaching qualifications.

***Key words:*** Belarusian State University; Faculty of Philology; department as a structural division; language teaching methodology; methodology of teaching literature; rhetoric.

Кафедра рыторыкі і методыкі выкладання мовы і літаратуры філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта была створана для падрыхтоўкі студэнтаў у галіне методыкі філалагічнай адукацыі і рыторыкі. Асноўныя навуковыя напрамкі – тэарэтычныя і практычныя праблемы методыкі выкладання беларускай мовы і літаратуры, рускай мовы і літаратуры і рытарычнай падрыхтоўкі ва ўстановах вышэйшай і агульнай сярэдняй адукацыі. У межах і ў якасці працягу дадзеных напрамкаў таксама распрацоўваюцца пытанні навучання мове як замежнай, выкладанне літаратуры замежным студэнтам, праблемы дзелавой камунікацыі. Навуковая тэма кафедры сёння гучыць наступным чынам: «Інавацыі ў выкладанні рыторыкі, мовы і літаратуры ў адукацыйнах установах розных тыпаў» (2021–2025).

У ліку асноўных вучэбных прадметаў, навучанне якім замацавана за кафедрай, вылучаюцца методыка выкладання мовы (беларускай і рускай), методыка выкладання літаратуры (беларускай і рускай), а таксама рыторыка, дысцыпліны напрамку «Дзелавая камунікацыя» і дысцыпліны магістратуры. Іх выкладанне мае практыка-арыентаваны характар і накіравана на забеспячэнне якаснай падрыхтоўкі спецыялістаў-філолагаў у ходзе атрымання вышэйшай адукацыі.

Кафедра належыць да тых структурных адзінак філалагічнага факультэта, якія маюць адносна нядаўнюю, аднак насычаную і адметную гісторыю, што часткова адлюстроўвалася ў некаторых ранейшых публікацыях [1; 2; 3; 4]. У дадзеным дакладзе падаюцца звесткі, актуальныя ў сакавіку 2023 года.

У чэрвені 1988 года ўпершыню афармілася структурнае падраздзяленне, якое атрымала назву «Кафедра методыкі выкладання беларускай і рускай мовы і літаратуры». Пазней, у тым ліку ў сувязі з уключэннем курса рыторыкі у вучэбныя планы шэрагу факультэтаў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, кафедра была перайменавана і атрымала назву «Кафедра рыторыкі і методыкі выкладання мовы і літаратуры».

З часу заснавання і па 2004 год узначальвала кафедру і садзейнічала фарміраванню найлепшых традыцый яе работы доктар педагагічных

навук, прафесар Ларыса Аляксандраўна Мурына, член-карэспандэнт Акадэміі адукацыі Рэспублікі Беларусь, Заслужаны дзеяч навукі Рэспублікі Беларусь. Прафесарам Л. А. Мурынай быў унесены выключны асабісты ўклад у падрыхтоўку педагагічных кадраў вышэйшай навуковай кваліфікацыі, была ўзноўлена практыка правядзення аратарскіх конкурсаў і турніраў, у межах якіх студэнты маюць магчымасць праявіць свае здольнасці выступаць публічна і абмяркоўваць у рамках дыскусіі значныя пытанні сучаснасці. Дзейнасць Ларысы Аляксандраўны на працягу 15 гадоў у якасці старшыні і члена савета па абароне дысертацый, навуковага кіраўніка аспірантаў і кансультанта дактарантаў, паводле меркаванняў яе шматлікіх вучняў, вызначалася стратэгічным бачаннем актуальных пытанняў і будучыні развіцця сучаснай лінгваметодыкі, найвышэйшым прафесіяналізмам, добразычлівасцю, навуковай прынцыповасцю.



Доктар педагагічных навук, прафесар Ларыса Аляксандраўна Мурына

Ужо ў першыя гады станаўлення кафедры на ёй пачалі ствараццa арыгінальныя і фундаментальныя работы, якія паслужылі асновай для паспяховай арганізацыі навучальнага працэсу, у прыватнасці кніга Л. А. Мурынай «Методика русского языка в школах Белоруссии» (1990). У далейшым выйшлі ў свет напісаныя прафесарам Л. А. Мурынай дапаможнікі па рыторыцы (на рускай і беларускай мовах). Калектывам кафедры паслядоўна распрацоўваліся шматлікія кампаненты вучэбна-метадычных комплексаў: «Практикум по методике преподавания русско-

го языка» (1999), «Практикум по истории риторики» (2002), «Практикум по теории риторики» (2002), «Риторика: Курс лекций» (2002), «Лекции по актуальным вопросам методики преподавания русского и белорусского языка» (2003), «Лекции по актуальным вопросам методики преподавания белорусской и русской литературы» (2003), «Формы контроля самостоятельной работы студентов по риторике» (2003) і інш.

Адным з вядучых і шырока вядомых у нашай краіне вучоных-метадыстаў – прафесарам, выдатнікам адукацыі Рэспублікі Беларусь, заслужаным работнікам Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта Франяй Міхайлаўнай Ліцвінка – былі выдадзены курс лекцый «Методика изучения разделов школьного курса русского языка» (2001) і базавы вучэбны дапаможнік для студэнтаў філалагічных спецыяльнасцей універсітэтаў «Методика преподавания русского языка в школе» (2015). Найноўшае выданне гэтага фундаментальнага і інфарматыўна насычанага дапаможніка ўбачыла свет у 2020-м годзе. Франя Міхайлаўна Ліцвінка – высокакваліфікаваны, вопытны прафесіянал і педагог-майстар – прымала вельмі актыўны і кампетэнтны ўдзел у падрыхтоўцы навукова-педагагічных кадраў вышэйшай кваліфікацыі. Як сапраўднага прафесіянала, Франю Міхайлаўну характарызуюць фундаментальныя лінгвістычныя веды і шырокая метадычная эрудыцыя, найвялікшая працавітасць і бескарыслівае служэнне свайму навукова-педагагічнаму прызванню, унутраная высакароднасць і інтэлігентнасць.

У якасці сумяшчальніка на кафедры выкладаў прафесар Васіль Ульянавіч Протчанка – вядомы беларускі вучоны-метадыст, аўтар навуковых манаграфій, узнагароджаны за заслугі ў галіне адукацыі медалём Францыска Скарыны.

У розныя гады на кафедры працавалі, аддаючы падрыхтоўцы студэнтаў свой шматгранны прафесійны вопыт, майстэрства і душэўную энергію, доктар педагагічных навук Ларыса Мікалеўна Гамеза, дацэнты Зінаіда Браніславаўна Варановіч, Марыя Пятроўна Дубаграева, Таццяна Яўгенаўна Зыль, Валянціна Афанасьеўна Лашкевіч, Ніна Барысаўна Рашэтнікава, Маргарыта Барысаўна Яфімава, старшыя выкладчыкі Клара Васільеўна Рыжанкова, Наталля Іванаўна Сталівоненка, Тамара Васільеўна Сянюта, Ганна Браніславаўна Шапілава, метадыст Раіса Яфімаўна Левіна і інш.

Доўгія гады методыку выкладання рускай літаратуры на філалагічным факультэце вяла старшы выкладчык кафедры Валянціна Афанасьеўна Каравушкіна – дасведчаны педагог, адданы сваёй прафесіі, аўтар

шэрагу запатрабаваных практыкай навучальных выданняў, у тым ліку дапаможніка «Урок литературы в средней школе» (1985).

Усебаковую дапамогу студэнтам у арганізацыі іх самастойнай працы на кафедры і супрацоўнікам – у афармленні неабходных дакументаў працяглы час аказвалі вопытныя, адказныя метадысты Аэліта Іванаўна Сакольчык і Таццяна Мікалаеўна Кур'яновіч (цяпер – метадыст дэканата філалагічнага факультэта). У дадзены перыяд на гэтым адказным участку працуе спецыяліст – Алена Эдуардаўна Бурак.

Супрацоўнікамі кафедры падтрымліваюцца эфектыўныя кантакты з вучонымі блізкага і далёкага замежжа, у прыватнасці шляхам удзелу ў навукова-практычных канферэнцыях і падрыхтоўцы навуковых выданняў у Расійскай Федэрацыі, Казахстане, Кітайскай Народнай Рэспубліцы і іншых краінах. Вядзецца работа з замежнымі аспірантамі. Сёння на кафедры навучаюцца 3 саіскальнікі з Кітайскай Народнай Рэспублікі. У папярэдні час праходзілі навучанне аспіранты з Ісламскай Рэспублікі Іран і іншых замежных краін. Міжнароднае супрацоўніцтва ажыццяўляецца са звязанымі міжнароднымі дамовамі ўніверсітэтамі.

У арганізацыі функцыянавання факультэцкага Цэнтра філалагічных паслуг (працаваў у ранейшыя гады), які забяспечваў падрыхтоўку абітурыентаў да ўступных іспытаў і садзейнічаў атрыманню студэнтамі-філолагамі ведаў і ўменняў па дадатковых моўных курсах, актыўны ўдзел прымалі яго дырэктар – прафесар Вольга Уладзіміраўна Праскаловіч, метадыст Аэліта Іванаўна Сакольчык і многія выкладчыкі кафедры.

Няўхільна расце навуковы патэнцыял кафедры. У 2015 г. В. У. Праскаловіч была паспяхова абаронена доктарская дысертацыя «Тэарэтыка-метадычная сістэма сродкаў культуратворчага развіцця вучняў V–XI класаў у працэсе навучання беларускай літаратуры», зацверджаная ў 2016 годзе (навуковы кансультант – доктар філалагічных навук, прафесар Таццяна Іванаўна Шамякіна).

2021 год адзначыўся абаронай Ірынай Уладзіміраўнай Таяноўскай доктарскай дысертацыі «Эвристически ориентированная лингвометодическая система развития учебно-коммуникативной текстообразующей компетенции учащихся (5–11 классы)», зацверджанай у 2022 годзе (навуковы кансультант – доктар педагагічных навук, прафесар, рэктар Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта Андрэй Дзмітрыевіч Кароль). Ірына Уладзіміраўна 16 гадоў узначальвала кафедру рыторыкі і методыкі выкладання мовы і літаратуры пасля прафесара Л. А. Мурынай.

Таксама ўзгадаем дзве адносна нядаўна абароненыя пры ўдзеле кафедры кандыдацкія дысертацыі:

«Обогащение лексического запаса китайских студентов-филологов русскими устойчивыми сравнениями» (Цюй Тао, 2019, навуковы кіраўнік – доктар педагагічных навук, прафесар Франя Міхайлаўна Ліцвінка);

«Методика формирования системы коммуникативных качеств речи у студентов-филологов в процессе взаимосвязанного изучения стилистики и культуры речи» (Хоміч Гардзей Васільевіч, 2017, навуковы кіраўнік – кандыдат педагагічных навук, дацэнт Таццяна Уладзіміраўна Ігнатовіч).

Зараз на кафедры навучаюцца 3 беларускія аспіранты.

Прафесар кафедры В. У. Праскаловіч, якая паспяхова ўзначальвала кафедру ў папярэдні перыяд і з'яўляецца вядомым і прызнаным спецыялістам у галіне методыкі выкладання беларускай літаратуры, у 2021 годзе удастоена звання «Жанчына года БДУ» за свае дасягненні ў вучэбна-метадычнай рабоце.

Сёння з 14 прадстаўнікоў прафесарска-выкладчыцкага складу кафедры – 2 дактары і 9 кандыдатаў педагагічных навук, 1 кандыдат філалагічных навук, 1 доктар гуманітарных навук у галіне мовазнаўства. На кафедры праводзяцца навукова-метадычныя семінары, педагагічныя чытанні па выніках праходжання практык, навукова-практычныя канферэнцыі (Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «Аксіялогія філалагічнай адукацыі ў кантэксце падрыхтоўкі педагога будучыні»). З 2000 года выдаецца міжвузаўскі зборнік навуковых артыкулаў «Камунікатыўная кампетэнцыя: прынцыпы, метады, прыёмы фарміравання». На дадзены момант з друку ўжо выйшла 17 выпускаў зборніка. Вядзе сваю дзейнасць навукова-метадычная школа БДУ «Тэорыя і практыка выкладання мовы, літаратуры і рыторыкі». Кіраўнік навуковай школы на сучасным этапе – доктар педагагічных навук, прафесар кафедры рыторыкі і методыкі выкладання мовы і літаратуры В. У. Праскаловіч.

Важным і адказным напрамкам дзейнасці кафедры з'яўляецца ўдзел у падрыхтоўцы дзяржаўных дакументаў у сферы філалагічнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь, вучэбных праграм, падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў, метадычных рэкамендацый, дыдактычных і дыягнастычных матэрыялаў, тэставых заданняў, рабочых сшыткаў на друкаванай аснове, каляндарна-тэматычнага планавання, электронных адукацыйных рэсурсаў і іншых кампанентаў вучэбна-метадычных комплексаў для ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі.



Кафедра рыторыкі і методыкі выкладання мовы і літаратуры філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта

Супрацоўнікі кафедры – аўтары і сааўтары вучэбных дапаможнікаў па беларускай літаратуры (прафесар В. У. Праскаловіч, загадчык кафедры А. А. Акушэвіч), беларускай мове (дацэнт Ірына Мікалаеўна Саматыя), рускай мове (намеснік дэкана факультэта, дацэнт Таццяна Васільеўна Мальцэвіч, дацэнт Таццяна Уладзіміраўна Рубанік, якая ў папярэдні час таксама паспяхова ажыццяўляла кіраўніцтва кафедрай, дацэнт Інна Эдуардаўна Саўко, якой належыць цэлы шэраг папулярных сярод старшакласнікаў вучэбных дапаможнікаў, дацэнт Ірына Міхайлаўна Саніковіч, прафесар кафедры І. У. Таяноўская), рускай літаратуры (дацэнты Вольга Іванаўна Царова, Святлана Мікалаеўна Захарава).

У якасці прыкладу прывядзем толькі некалькі асобных выданняў, якія нядаўна пабачылі свет:

Бадзевіч, З. І. Беларуская мова: вуч. дапам. для 8 кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / З. І. Бадзевіч, І. М. Саматыя. Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2020.

Захарова, С. Н. Русская литература: учеб. пособие для 6 кл. учреждений общ. сред. образования с белорус. и рус. яз. обучения: в 2 ч. / С. Н. Захарова, Г. М. Юстинская. Минск : Новое знание, 2022.

Праскаловіч, В. У. Методыка выкладання беларускай літаратуры : практыкум / В. У. Праскаловіч. Мінск : БДУ, 2022.

Праскаловіч, В. У. Беларуская літаратура : вуч. дапам. для 5 кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання: у 2 ч. / В. У. Праскаловіч, М. В. Жуковіч, Л. К. Цітова. Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2021.

Таяновская, И. В. Современная риторика. Основы искусства речи: мысль – молчание – слово (эвристический курс-полилог): учеб.-метод. пособие / И. В. Таяновская; под общ. ред. А. Д. Короля. Минск : БГУ, 2020.

У падрыхтоўцы навукова-метадычных артыкулаў і іншых публікацый, прысвечаных актуальным пытанням выкладання філалагічных дысцыплін ва ўстановах агульнай сярэдняй і вышэйшай адукацыі, таксама пастаянна ўдзельнічаюць дацэнты Валянціна Юльянаўна Дылеўская, Святлана Анатольеўна Шантаровіч, старшы выкладчык Надзея Леанідаўна Ніжнёва-Ксенафонтава, якая разам з тым уваходзіць у склад аўтарытэтных творчых арганізацый – Саюз пісьменнікаў Беларусі і Саюз пісьменнікаў Расіі, выкладчык Ніна Сяргееўна Пратасеня.

Прафесарска-выкладчыцкі склад кафедры актыўна супрацоўнічае з навуковымі і навукова-метадычнымі часопісамі («Роднае слова», «Беларуская мова і літаратура», «Руская мова і літаратура» і інш.), асобныя прадстаўнікі кафедры ўваходзяць у рэдкалегіі перыядычных выданняў альбо з'яўляюцца іх навуковымі кансультантамі (В. У. Праскаловіч, І. Э. Саўко, В. І. Царова і інш.).

У адукацыйным працэсе калектыў кафедры спалучае традыцыйныя формы акадэмічнага выкладання з укараненнем інавацыйных тэхналогій і прыёмаў, сярод якіх – эўрыстычнае, праблемнае і праектнае навучанне, інфармацыйна-камп'ютарныя тэхналогіі, тэхналогія педагагічных майстэрняў, тэхналогія схематычных і знакавых мадэляў, тэхналогія развіцця крытычнага мыслення і інш. За гады існавання кафедры яе супрацоўнікі пашырылі варыятыўнасць выкарыстання разнастайных формаў вучэбнай працы студэнтаў; іх шырокі спектр укараняўся ў выглядзе арсенала форм самастойнай пазнавальна-практычнай дзейнасці навучэнцаў, які стаў здабыткам адукацыйнай практыкі факультэта. Акрамя базавых курсаў, на кафедры чытаюцца аўтарскія спецкурсы па актуальных праблемах методыкі выкладання мовы, літаратуры, рыторыкі. Пры кафедры працуюць спецсемінары для студэнтаў розных спецыяльнасцей; ажыццяўляецца падрыхтоўка курсавых, дыпломных і магістарскіх работ з выкарыстаннем тэарэтычных і эмпірычных метадаў даследавання.

Калектывам кафедры рэалізуецца агульнае і групавое кіраўніцтва педагагічнай практыкай студэнтаў-філолагаў, якая выконвае прафесійна-адаптацыйныя, дыягнастычныя, карэкцыйна-адукацыйныя, асобасна-развіццёвыя, выхаваўчыя, даследчыя і іншыя функцыі. На кафедры

праводзяцца педагагічная адаптацыйная, пераддыпломная педагагічная, камунікатыўна-дзелавая і навукова-педагагічная практыкі. Агульныя кіраўнікі практыкі сёння, якія дзейсна наладжваюць вырашэнне комплексаў задач практычнага навучання, – дацэнты В. Ю. Дылеўская, І. М. Саматыя, І. Э. Саўко.

Кафедра шчыльна і непасрэдна супрацоўнічае з заказчыкамі кадраў (працадаўцамі) і актыўна праводзіць навукова-метадычныя семінары, вэбінары і кансультацыі. Для студэнтаў філалагічнага факультэта БДУ арганізуюцца майстар-класы, якія адлюстроўваюць творчы і прагрэсіўны вопыт выкладання настаўнікаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі.

Супрацоўнікамі кафедры вялося навучанне класічнаму для ўніверсітэцкай адукацыі прадмету «Рыторыка» («Аратарскае майстэрства») студэнтаў не толькі розных спецыяльнасцей філалагічнага факультэта, але і іншых факультэтаў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Пры гэтым у цэнтры ўвагі ўвесь час знаходзілася забеспячэнне адпаведнай прафесійнай арыентацыі выкладання.

Пад кіраўніцтвам выкладчыкаў кафедры студэнты неаднаразова рабіліся лаўрэатамі прэстыжных прамоўніцкіх конкурсаў (напрыклад, Міжнароднага конкурсу прамоўніцкага майстэрства сярод студэнтаў «Цыцэроній»), паспяхова ўдзельнічалі ў творчым конкурсе «Залатое пяро "Белай Русі"». Выкладчыкі рытарычных дысцыплін рэгулярна праводзяць конкурсы і турніры прамоўніцкага майстэрства сярод студэнтаў філалагічнага і іншых факультэтаў БДУ, іншыя творчыя конкурсы і прэзентацыі.

Многія выкладчыкі кафедры рэгулярна выступалі і выступаюць з практычна значнымі і змястоўнымі лекцыямі перад настаўнікамі ў гарадскіх, абласных і рэспубліканскіх установах развіцця адукацыі.

Супрацоўнікі кафедры ўдзельнічаюць у падрыхтоўцы і правядзенні алімпіяд па беларускай мове і літаратуры, рускай мове і літаратуры, рэспубліканскага конкурсу работ даследчага характару і тым самым садзейнічаюць развіццю пазнавальных інтарэсаў і філалагічнай эрудыцыі адораных вучняў, удзельнічаюць у журы разнастайных прамоўніцкіх конкурсаў. На пашыранай аснове праводзіцца маштабная і неперапынная прафарыентацыйная работа з навучэнцамі выпускных і перадвыпускных класаў.

На кафедры ажыццяўляецца падрыхтоўка магістрантаў вочнай і завочнай формы навучання па спецыяльнасці 1-08 80 02 «Тэорыя і методыка навучання і выхавання (у галіне моваэнаўства)». Сёння ідзе работа па адкрыцці новай спецыяльнасці магістратуры «Філалагічная адукацыя».

У межах дадзенай публікацыі немагчыма падрабязна расказаць пра ўсе здабыткі і старонкі жыцця кафедры рыторыкі і методыкі выкладання мовы і літаратуры за 35 гадоў яе існавання. Гэтаму можа быць прысвечана асоб-

ная кніга. Кафедра, з аднаго боку мае сталыя традыцыі, а з іншага – цікавыя перспектывы развіцця і ўдасканалення, якому, як вядома, няма мяжы. Напрыклад, адзін з магчымых найбліжэйшых праектаў кафедры, які зараз абмяркоўваецца, – гэта адкрыццё Цэнтра рыторыкі і культуры маўлення.

Такім чынам, сістэмаўтваральным у рабоце кафедры рыторыкі і методыкі выкладання мовы і літаратуры з'яўляецца дыялектычнае ўзаемадзеянне прафесійна-педагагічных і сэнсажыццёвых катэгорый пераемнасці і перспектыўнасці. Адзін з дэвізаў нашай кафедры «Супрацоўніцтва, сутворчасць, садружнасць» сугучны ідэям плённага, канструктыўнага дыялогу. Дзейнасць супрацоўнікаў кафедры цалкам падпарадкавана задачам фарміравання камунікатыўна развітой і адказнай, інтэлектуальна і духоўна багатай, творча актыўнай асобы студэнта і навучэнца XXI стагоддзя – чалавека высокай культуры і пераканаўчага, яркага, уплывовага маўленчага майстэрства, падрыхтоўцы кваліфікаванага прафесіянала ў галіне выкладання беларускай мовы і літаратуры, рускай мовы і літаратуры, а таксама рыторыкі.

**Бібліяграфічныя спасылкі**

1. Кафедра рыторыкі і методыкі выкладання мовы і літаратуры [Электронны рэсурс]. URL: https://philology.bsu.by/by/facultyinfo/chairs/2163-kafedra-rytoryki-i-metodyki-vykladannya-movy-i-litaratury (дата звароту: 20.03.2023).

2. Коммуникативная компетенция: принципы, методы, приемы формирования: сб. науч. ст. Вып. 9. Минск : БГУ, 2009. [Электронный ресурс]. URL: https://elib.bsu.by/handle/123456789/13337 (дата обращения: 20.03.2023).

3. Окрыленные словом: к 80-летию филологического факультета БГУ / ред. совет: И. С. Ровдо (пред.) [и др.]. Минск : БГУ, 2019.

4. Філалагічны факультэт. 75 гадоў / рэд. савет: І. С. Роўда (старш.) [і інш.]. Мінск : БДУ, 2014.